ТРАДЫЦЫІ І НАВАТАРСТВА Ў МОВЕ

М.М. Аляхновіч

УСТОЙЛІВАЯ АДЗІНКА МОВЫ І АСОБА: СЭНСАВАЕ ПОЛЕ АЦЭНКІ

Семантыка многіх фразеалагічных адзінак (ФА) мае такую характэрную адзнаку, як ацэначнасць. Прычым паняцце ацэначнасці неадназначна трактуецца навукоўцамі: іншы раз яно атаясамліваецца з характарыстычнасцю, хаця сэнсавыя адносіны адзінак ацэнка – характарыстыка, ацэначнасць – характарыстычнасць праяўляюцца на гіпоніма-гіперанімічным узроўні.

У.П. Жукаў адзначае, што “под оценочным значением понимается положительная или отрицательная характеристика лица или предмета со стороны его устойчивых, постоянных свойств, а не случайных и временных” [2, с. 57].

Такім чынам, ФА з сэнсавым полем ацэнкі можна размежаваць на адзінкі, якія даюць ацэнку непасрэдна суб’екта (асобы) і якія ацэньваюць аб’ект (прадмет, з’яву і г. д.). Што да ФА першай групы, то сюды ўваходзяць даволі разнародныя па семантыка-структурных паказчыках адзінкі.

Значэнне ФА далёка не заўсёды “падказваецца” словамі-кампанентамі, вельмі часта яно ніяк не звязана са значэннем сваіх састаўных. Гэтаксама неабавязкова мець у структуры ФА кампанент са значэннем асобы, каб фразеалагізм набыў семантыку ацэнкі асобы. Таму ўсе ФА гэтага тыпу можна падзяліць на дзве групы: да першай адносім фразеалагізмы, якія ў структуры не маюць кампанентаў з семантычнай адзнакай асобы, а да другой – устойлівыя адзінкі, якія ў структуры маюць кампаненты з семантычнай адзнакай асобы.

Само паняцце асобы семантычна палярызаванае: ад станоўчай (узвышанай) праз стылістычна нейтральную да адмоўнай, негатыўнай семантыкі. Таму, як заўважае М.Шавыркін, “атрымліваецца, што пры выкарыстанні слова *асоба* ў розных значэннях стваральная энергія, якая спадарожнічае яму ў адных выпадках, нейтралізуецца (знішчаецца) ў іншых” [5, с. 109].

Сярод устойлівых адзінак сэнсавага поля ацэнкі, якія не маюць у структуры кампанента-паказчыка асобы, колькасна выдзяляюцца ФА

з саматычнымі кампанентамі (галава, рука, нага, язык і інш.). Праілюструем факт некалькімі прыкладамі ўстойлівых адзінак з кампанентам ***галава***: *галава варыць* – хто-н. разумны, кемлівы, знаходлівы; *галава садовая* – нездагадлівы, няўважлівы, рассеяны чалавек; *галава яловая* – бесталковы, дурны чалавек; *гарачая* галава – нястрымны, неразважлівы чалавек, які захапляецца, дзейнічае паспешна; *дзіравая галава* – хто-н. забыўчывы, рассеяны, мае кепскую памяць; *дубовая галава* – тупы, неразумны чалавек, тупіца; *курыная галава, пустая галава* – нездагадлівы, прастакаваты чалавек; *без клёпкі ў галаве* – прыдуркаваты, з дзівацтвамі; *хоць кол на галаве чашы* – немагчыма пераканаць каго-н., растлумачыць каму-н. што-н. Пра ўпартага, няўступчывага чалавека (тут і далей прыклады са слоўніка І.Я. Лепешава).

Група фразеалагізмаў, якія ў структуры маюць кампанент з семантычнай адзнакай асобы, не такая шматлікая, як першая. Гэта можна вытлумачыць, па-першае, тым, што вобразная аснова ФА і яе кампанентны склад грунтуюцца на адзінках аднолькавай ці блізкай семантыкі (*з царом у галаве* – вельмі разумны, кемлівы; *блудны сын* – легкадумны, свавольны чалавек, які раскаяўся ў сваіх памылках; *сукін сын* – нягоднік; *мамчын сынок* – распешчаны, збалаваны, ні да чаго не прыстасаваны хлопчык, малады чалавек; *дурны поп хрысціў* – хто-н. тупы, неразумны ці наіўны, нездагадлівы; *шалёны (утрапёны, ліхі*) *поп хрысціў* – хто-н. вельмі рашучы, неўраўнаважаны, схільны да нечаканых учынкаў; *царска дівка* – пра вельмі прыгожую дзяўчыну [1]. Па-другое, значная частка ФА гэтай групы мае ў структуры кампанент-антрапонім (уласнае імя, прозвішча), што вельмі часта “прывязвае” фразеалагізм да пэўнай мясцовасці, надае яму вузкарэгіянальны характар; *другі Росцік* – пра чалавека, які носіць абутак вялікага памеру (Альшаны Столінскага раёна, [1]). Таму лагічней будзе размежаваць ФА на адзінкі, дзе кампанент са значэннем асобы выражаецца агульным назоўнікам, і на адзінкі, дзе кампанент выражаецца ўласным назоўнікам ці ўтвораным ад яго прыналежным прыметнікам (у большасці выпадкаў – субстантываваным). Што да ФА першай групы, то яны звычайна выходзяць за межы рэгіянальных і маюць сталую тэндэнцыю да пашырэння сферы ўжывання: *вольны казак* – свабодны, ні ад каго не залежны чалавек; *казанская сірата* – той, хто прыкідваецца пакрыўджаным, няшчасным; *базарная баба* – крыклівы, сварлівы, грубы чалавек; *зух супроць мух* – смелы, самаўпэўнены толькі сярод слабых; *сам чорт не брат* – каму-н. нічога не страшна, нічога не значыць, усё хоць бы што; *студэнт смаргонскай акадэміі* – няўмелы, няўклюдны, медзведзяваты ў абыходжанні чалавек (прыклад Ф.М. Янкоўскага [6]).

ФА з кампанентам-уласным імем ці прыметнікам ад уласнага імя адзначаюцца даведнікамі народна-гутарковай мовы, але рэдка набываюць агульнавядомы характар і “прапісваюцца” ў слоўніках нарматыўных. Так, на Мсціслаўшчыне занатаваў Ф.Янкоўскі фразеалагізм *лёгенькі Петрачок* – паслухмяны і спрытны чалавек, які ахвотна дапамагае другім. Выраз *лёгенькі Петрачок*, але са значэннем ’лёгкі на язык, на абяцанні чалавек’ сустракаецца і ў зборніку прыказак І.Насовіча [6, с. 213].

Адзначым яшчэ некалькі ўстойлівых адзінак са значэннем якаснай ацэнкі асобы, што даюцца ў працах Ф.Янкоўскага: *Магдаю залівацца* – весела і заразліва, раскаціста смяяцца (да вайны 1941–1945 гг. бытаваў на мінскай Старажоўцы); *Лупалаўскі Падаруй* (Лупалава – зарэчная частка Магілёва, дзе стагоддзямі жылі гарбары, Падаруй – прозвішча); *як бондарава карова* ’зняважліва кажуць на валацугу, пахатніка, які любіць хадзіць без справы з хаты ў хату’ (Глуск). Як бачым, вузкамясцовы характар дыялектных ФА пры неабходнасці падкрэсліваецца адпаведным каментарыем.

Слоўнікі беларускай народнай фразеалогіі фіксуюць падобныя адзінкі, занатаваныя ў розных кутках Беларусі: *Іцкава галава* – вельмі разумны, кемлівы, хто хутка прыстасоўваецца да жыцця [4]; *бык Муравіцкого* – пра дужага, але неразумнага чалавека [1] і інш.

Літаратура

1. Дыялектны слоўнік Брэстчыны. Мінск. Навука і тэхніка, 1989.
2. Жуков В.П. Семантика фразеологических оборотов. М.: Просвещение, 1978.
3. Лепешаў І.Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы. У 2-х т. Мінск, 1993.
4. Мяцельская Е.С., Камароўскі Я.М. Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі. Мінск, 1972.
5. Шавыркін М. Асоба і мова // Роднае слова. 2005. № 3.
6. Янкоўскі Ф.М. Беларуская фразеалогія: Фразеалагізмы, іх значэнне, ужыванне. Мінск, 1968.

А.В Губкіна

СУФІКС *-ЕЦ (-АЦ, -ЭЦ)* ПРЫ ЎТВАРЭННІ НАЗВАЎ АСОБ ПАВОДЛЕ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Старажытны суфікс *-ецъ* уяўляе з сябе адпаведнік праславянскага суфікса *-ьць*, які з’яўляецца фанетычнай мадыфікацыяй фарманта **-ко* ў злучэнні з папярэднім *-ь-*, узнікшым на месцы *ĭ* з наяўным чаргаваннем зычных *к/ц* у суфіксальным элеменце [2, с. 55]. В.Б. Хацкевіч лічыць, што сучасны суфікс *-ец* аб’яднаў у сабе некалькі розных суфіксаў, таму словы з -